

1.

# Наблізіцца да Бога, каб разгледзець **чалавека**

## «ЛЕСВІЦА Ў НЕБА» УЛАДЗІМІРА ВІШНЕЎСКАГА Ў НАЦЫЯНАЛЬНЫМ МАСТАЦКІМ МУЗЕІ

**Пётра Васілеўскі**

**Уладзіміру Вішнеўскаму споўнілася 65 год, і на сваёй выставе ён паказаў рэтраспектыву твораў, што даўно сталі класікай беларускай графічнай школы, а таксама аркушы апошняга часу, з якіх відаць, што майстар не спыняецца на дасягнутым.**

Персанальная выстава — рэч надзвычай адказная. Як сольны канцэрт. Можна ўсё жыццё праспяваць у хоры паводле зацверджанага рэпертуару альбо браць удзел выключна ў групавых выставах па загадзя замоўленых тэмах — і быць пры гэтым цалкам задаволеным сваім статусам дый увогуле жыццём. Уладзімір Вішнеўскі — чалавек іншы. Ён ніколі не адмовіцца паўдзельнічаць у добрай справе на карысць Бацькаўшчыны. Яго творы можна ўбачыць на выставах патрыятычнага характару, але ніколі ён не будзе падпарадкоўвацца чужой рэжысуры. Творча супрацоўнічаць з калегамі — калі ласка, але пры ўмове, што яго прымаюць такім, які ён ёсць, і не будуць спрабаваць перайначыць.

Ну а персаналія, калі ты на авансцэне, — рэч асаблівая. Тым больш што зрабіць персаналію ў паважаным ўзросце значна цяжэй, чым на пачатку творчага шляху. Маладому мастаку многае даруецца. Маўляў, наперадзе шмат часу. Паспее яшчэ досведу назапасіць. А творчы крызіс мэтра ў вачах публікі можа перакрэсліць нават тое, чым калісьці заваяваў глядацкую аўдыторыю.

Мо ў творчасці Уладзіміра Вішнеўскага і здараліся крызісныя сітуацыі, калі, як пісаў Алесь Разанаў, «па-новаму не ўмею, а па-старому ўмею — не магу», але публіка пра іх не ведала. Проста ў пэўны момант мастак, дасягнуўшы віртуознасці ў нейкім стылёвым напрамку, нечакана змяняў почырк і тэматыку. Прычым адчувалася, што гэта не рух наўпрост ці ўбок, а чарговая прыступка наверх. Мабыць, нездарма і сваю юбілейную экспазіцыю творца назваў «Лесвіца ў неба». Лесвіца не ліфт, тут кожная прыступка даецца цяжка, а кожны крок узбагачае досведам. Шлях ідзе не на нейкі паверх, дзе можна спыніцца, задаволена азірнуцца назад, нарэшце адпачыць, а ў неба, значыць — у бясконцасць.

Можна сказаць, што Уладзіміру Вішнеўскаму пашчасціла на самым пачатку творчага шляху. У час, калі ён вучыўся ў Тэатральна-мастацкім інстытуце, — а гэта другая палова 1970-х, — у Беларусі склалася адметная нацыянальная школа. Прынамсі ў графіцы. Яна была прадстаўлена такімі асобамі, як Арлен Кашкурэвіч, Георгій Паплаўскі, Барыс Забораў, Людвіг Асецкі, Васіль Шаранговіч. Гэта вельмі прынцыповы момант, таму што ў навучальным працэсе надзвычай важны псіхалагічны чыннік. Па-за радзімаю (праўда, у Савецкім Саюзе радзіму разумелі вельмі шырока, я ў дадзеным выпадку не пра тое) можна засвоіць выдатныя веды і навучыцца выдатнаму майстэрству, але пры гэтым згубіць ментальную сувязь з родным краем і праз гэта не стаць нацыянальным мастаком. Для прыкладу згадаю нашых мэтраў Заіра Азгура і Міхаіла Савіцкага. Што яны выдатныя мастакі, не падлягае сумневу, але беларускі нацыянальны складнік у іх творчасці, лічы, адсутнічаў альбо быў невыразным.

Дык вось Уладзімір Вішнеўскі, чалавек з цудоўным прыродным талентам, на шчасце для сябе і для нашай краіны вышэйшую мастацкую адукацыю атрымаў у Беларусі. Ды і аднакурснікі ў яго былі не абы-якія. Найбольш вядомыя на тым курсе акрамя Вішнеўскага — Анатоль Александровіч і Віктар Мікіта. Сёння яны ў статусе класікаў. Мяркуючы па дыпломнай рабоце, у 1979 годзе спадар Уладзімір яшчэ вагаўся, якой графічнай тэхніцы, якой стылістыцы і тэматыцы аддаць перавагу. Фактычна ён зрабіў не адну работу, а дзве: ілюстрацыі да «Слова аб палку Ігаравым» у тэмперы і афорты да кнігі Алеся Разанава «Каардынаты быцця». І тэмы, і тэхнікі нібыта з розных полюсаў. Пазней мастак аддаў перавагу ўсё ж такі афорту. Гэта значыць, тону над колерам. Праўда, ёсць нюанс: нават на гэтай выставе большасць афортаў каляровыя. Але тут колер у асноўным фонавы і толькі зрэдку служыць для акцэнтавання найбольш важных складнікаў кампазіцыі. Гэта зусім не тое, што колер у жывапісе, дзе ён сутнасна самадастатковы і ў структуры твора вызначальны.



2



3.



4.

А вось сваю любоў да колеру як выяўленчага сродку мастак рэалізаваў у нечаканым для графіка рэчышчы: захапіўся паліхромнай скульптурай. У экспазіцыі выставы яна займае заўважнае месца. І, як мне падалося, недзе нават стварае эфектны дысананс графічным аркушам. Не дзіва, калі скульптар займецца жывапісам ці графікаю, а вось каб графік пераключаўся на пластыку — з'ява даволі рэдкая. У Беларусі, здаецца, яшчэ толькі Алег Карповіч займаецца чымсьці падобным. Менавіта падобным, бо яго пластыка — гэта пераведзеныя ў абём яго ж малюнкі, а ў выпадку Вішнеўскага гаворка мусіць ісці пра новую іпастась.

Пластыка Уладзіміра Вішнеўскага — гэта не эскізы манументаў, і для аздобы грамадскіх інтэр'ераў яна не пасуе. Бадай, яе адзіная функцыя — грэць душу ў прасторы прыватнай. Гэта не ікона, а хутчэй талісман язычніцкага кшталту.

У творах спадара Уладзіміра знаўцы знаходзяць дынаміку, драматычнасць і яшчэ музыкальнасць. Калі пагадзіцца з наяўнасцю апошняга чынніка, дык танальнасць гэтых прац недзе паміж народнымі абрадавымі песнямі нашага краю і храмавымі песняспевамі — хутчэй касцельнымі, чым царкоўнымі. І справа не толькі ў частым звароце да біблейскіх сюжэтаў. Уладзімір Вішнеўскі і краявід малюе як храм, і славутыя людзі нашага краю на ягоных аркушах глядзяцца як апосталы.

Мастак грунтоўна і вобразна-эмацыйна распрацоўвае тэму гісторыі нашай Айчыны да моманту ўваходжання Беларусі-Літвы ў склад Расійскай імперыі. Потым пачынаецца іншая гісторыя, якая мастаку не надта цікавая. Яго вабіць беларуская «Атлантыда» — Полацкая дзяржава і яе спадкаемцы Вялікае Княства і Рэч Паспалітая. Гэта той пласт нацыянальнай гісторыі, што пачаў актыўна вывучацца і асэнсоўвацца культурніцкай грамадою якраз тады, калі малады мастак шукаў сваю тэму, ідэю, а яшчэ лепей — звышідэю, кшталту лесвіцы ў неба, якая б надавала сэнс жыццю, апраўдвала непазбежныя страты на творчым шляху. Менавіта рэстаўрацыя/рэканструкцыя беларускай шляхетнай ментальнасці, растворанай у няўцямным савецкім патрыятызме як у саляной кіслаце, адраджэнне беларускага ліцвінства сталі для Уладзі-

міра Вішнеўскага справаю жыцця. І ўжо шмат гадоў ён робіць гэтую справу метадычна і грунтоўна. Ды яшчэ і іншых вучыць, бо з 1987 года выкладае на кафедры графікі сваёй альма-матар. Мае званне прафесара.

Яшчэ дадам, што Беларусь бачыцца мастаку не нейкай самадастатковай выспай, але часткай вялікага свету, краінай на скрыжаванні цывілізацыйных шляхоў і ўплывовым цэнтрам культурніцкай сілы. І гэтым ён адрозніваецца ў лепшы бок ад тых, для каго беларускасць — гэта толькі этнаграфія, прычым вясковая.

Экспазіцыя збольшага складалася з твораў добра вядомых. Гэта асобныя аркушы «Карона Міндоўга», «Полацкія напевы», «Народжаны на Крэўскай зямлі», «Камень Рагвалода», «Апошні паляўнічы», «П'ета Чарнобыльская»; тэматычныя нізкі на біблейскія і гістарычныя сюжэты, а таксама — прысвечаныя геніяльным асобам, чые карані ў беларускай зямлі.

Натуральнае жаданне творцы выйсці за межы звыклага, засвоенага, зразумелага, адкрыць для сябе і сваёй аўдыторыі новыя далягляды і нечаканыя ракурсы абумовіла зварот мастака да буйнамаштабнай графікі, блізкай памерамі да станковага жывапісу, у тэхніцы акрылу, акварэлі, сепіі, тушы. Па сутнасці спадар Вішнеўскі, прайшоўшы жыццёвае кола ды набраўшыся пра-


6.


5.

фесійнага і эмацыйнага досведу, вярнуўся да сваёй маладосці, калі вагаўся паміж мастацтвам тэхнічна складаным і эмацыйна разняволеным. Афорт патрабуе ад мастака жорсткай, нават таталітарнай тэхналагічнай дысцыпліны, а праца пэндзлем і пяром дае пэўную свабоду, стварае прастору для імправізацыі. Магчыма, на жыццёвай лесвіцы майстра намалявалася новая творчая прыступка.

Новы напрамак у творчасці Уладзіміра Вішнеўскага на выставе найлепшым чынам прэзентавалі ілюстрацыі да кнігі вершаў Уладзіміра Някляева «Знічы кахання». Ад метафарычнасці і містыцызму гісторыі мастак прыйшоў да асэнсавання фантасмагорый звычайнага чалавечага жыцця, дзе, што б ні рабілася ў свеце, стрыжнёвым складнікам застаецца каханне. Хтосьці скажа, што мастак, дасягнуўшы ў сваёй творчасці вяршыні, пачаў спуск з гары. Маўляў, толькі што быў Космас, гістарычныя драмы і Хрыстовы жарсці, і раптам з нябёс на зямлю — чалавек з яго прыватнай праблемай знікаючага кахання. А як па мне, дык гэта далейшае ўзыходжанне. Бо трэба наблізіцца да Бога, каб разгледзець на зямлі чалавека.

На сваім свяце, на адкрыцці персанальнай выставы ў галоўным музеі краіны, Уладзімір Вішнеўскі не выглядаў імяніннікам. У мяне было ўражанне, што ён вырваўся з майстэрні, апрануты па-рабочаму, дзеля імпрэзы, якая без яго не магла б адбыцца, і чакае, калі ўсё скончыцца, каб зноў скіравацца ў майстэрню.

І яшчэ я падумаў: шляхта — яна і ў джынсах шляхта. Маю на ўвазе не толькі знакамітыя старасвецкія вусы мэтра, але ўвесь комплекс таго, што ён уяўляе з сябе як асоба, і ўсё, што ён як мастак і патрыёт робіць дзеля Айчыны.


7.

1. Апостал Васіль. Афорт, меца-тынта. 2005.
2. Архангел. З серыі да раздзела Бібліі «Саборныя пасланні апосталаў». Каляровы афорт. 2019.
3. Святы Юрый. Таніраваная папера, сепія. 2017.
4. Жаночая постаць з ракавінай на галаве. Таніраванае дрэва, разьба, кераміка. 1996.
5. Апошні паляўнічы. Афорт, меца-тынта, акватынта. 2002.
6. Праменад. Акварэль. 2014.
7. Прысвячэнне Уладзіміру Караткевічу. Афорт. 1995.



Мастацтва. – 2020. – № 12. – С. 10–13.